ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (1246) ● 7 чэрвеня 1979 г. Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫХАВАЦЬ САПРАЎДНАГА ГРАМАДЗЯНІНА: ПРАБЛЕМЫ І ЗАДАЧЫ МАРАЛЬНАГА І ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ● СПРАВЫ ПРАФСАЮЗНЫЯ ● ПРАЙШОЎ КАМСАМОЛЬСКІ СХОД НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ ● З ПАЧУЦЦЁМ ГІСТАРЫЧНАЙ АДКАЗНАСЦІ (ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАГА СХОДУ УНІВЕРСІТЭЦКАГА ДТСААФ) ● НАШЫ ВЫПУСКНІКІ (ПРАЦЯГ) ● НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ: ФОТАРЭПАРТАЖ З ПАЛІКЛІНІКІ ● ПРАЦУЕ ШКОЛА ЮНКОРАЎ ● У АБ'ЕКТЫВЕ — СЕСІЯ ● ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА ● ЗНАЙСЦІ СЯБЕ (СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ) ● КАФЕДРА АГУЛЬНАГА СМЕХАРОБСТВА.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ВЫХАВАЦЬ САПРАЎДНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

У развітым сацыялістычным грамадстве, якое мае вялікія магчымасці для ўсебаковага, гарманічнага развіцця асобы, заканамерна ўзрастае роля маральнага фактара, расшыраецца сфера дзейнасці эстэтычных пачаткаў. Улічваючы гэта, XXV з'езд КПСС указаў на неабходнасць узмацнення маральнага і эстэтычнага выхавання савецкіх людзей, а XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі вызначыў канкрэтныя задачы па прыцягненню моладзі рэспублікі да маральных і эстэтычных каштоўнасцей.

Імкнучыся да ўдасканалення ўсёй нашай сістэмы навучання, дэканат, партбюро, камітэт камсамола, прафбюро факультэта журналістыкі звярнулі ўвагу на маральна-эстэтычнае выхаванне як арганічную частку камуністычнага выхавання. З гэтай мэтай былі праведзены арганізацыйныя мерапрыемствы, створана спецыяльная камісія па маральна-эстэтычнаму выхаванню на нашым факультэце, другі раз за кароткі тэрмін гэта пытанне абмяркоўвалася на адкрытым партыйным сходзе, на пасяджэннях кафедр, выпрацаваны рэкамендацыі куратарам.

Акрамя стаўшых ужо традыцыйнымі на факультэце сустрэч з дзеячамі мастацтва, экскурсій, культпаходаў, выкарыстоўваецца абмеркаванне праблем маральнага выхавання на камсамольскіх сходах, куратарскім часе, на пасяджэннях гурткоў па спецыяльнасці.

У нас ёсць несумненныя поспехі ў прыцягненні студэнтаў да мастацка-творчай дзейнасці. Мы думаем над рэкамендацыямі па выкарыстанню магчымасцей грамадска-палітычнай практыкі ў падрыхтоўцы студэнтаў да практычнага здзяйснення маральна-эстэтычнага выхавання.

Усё часцей выкарыстоўваюцца маральна-эстэтычныя аспекты ў выкладаемых на факультэце дысцыплінах. З мэтай узмацнення маральна-эстэтычнага ўздзеяння на студэнтаў абноўлен змест чытаемых курсаў і спецкурсаў на кафедрах тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, радыё і тэлебачання.

У нашай лекцыйнай і практычнай рабоце мы ўвесь час звяртаем увагу на адзінства сацыяльных і маральных пачаткаў, на ўзаемасувязь паміж грамадскімі мэтамі і духоўнымі імкненнямі асобы.

Ва ўстойлівым спалучэнні паняццяў маральнае і эстэтычнае апошняе ў нас больш ці менш адпрацавана. Устойліва склаліся і развіваюцца міжпрадметныя сувязі, такія, як абавязковыя лекцыі па эстэтыцы, факультатыўныя заняткі, вечары, работа ў кафедральных гуртках, удзел у мастацкай самадзейнасці і г. д. Асновы эстэтычных ведаў павінны закладвацца ў школе. Мы ж толькі як бы прымаем эстафету. Але даволі часта даводзіцца пачынаць спачатку, узводзіць будынак, не маючы фундамента.

Некаторыя студэнты, асабліва ў працэсе залікаў, шчыра выказваюцца: а навошта нам мастацтва з яго прамудрасцямі, навошта эстэтыка, навошта тэатр, калі мы па размеркаванню трапім у раённыя газеты, дзе нават аддзелаў культуры няма? Вот тут і высвятляецца, што мастацтва і жыццё часта не знаходзяць кропак сутыкнення. Мастацтва само па сабе, жыццё само па сабе. Гэта, на жаль, мае адносіны і да другой катэгорыі студэнтаў, якія цікавяцца мастацтвам, шчыра запэўніваюць, што любяць яго, умеюць натхнёна гаварыць аб паэзіі, разбіраюцца ў складанасцях сучаснай музыкі, а, пераступіўшы парог аўдыторыі, тушаць акуркі ў цвяточніцах, пляткараць у інтэрнаце і ствараюць эмацыянальны дыскамфорт суседзям па пакою. Адзін з галоўных праціўнікаў у нашай барацьбе за тое, каб чалавек быў чалавекам — мяшчанства.

Сёння полем ідэалагічнай барацьбы становяцца не толькі падзеі сучаснасці, але і вытокі рускай літаратуры і грамадскай думкі. Нездарма творчасць Дастаеўскага, Гогаля, Герцэна, Пісарава, Чарнышэўскага, Някрасава, Талстога выклікае палеміку і прамыя спекуляцыі за мяжой. Гісторыя літаратуры і журналістыкі, гісторыя грамадскай думкі — цудоўны спосаб для паказу магутных маральных традыцый народнай культуры, якая жывіць духоўную трываласць сучаснага савецкага чалавека. Тут у нас маса яшчэ да канца не выкарыстаных рэзерваў.

З вялікага вопыту гэтых вядомых людзей студэнты павінны выносіць не даты і назвы артыкулаў, а маральныя ўрокі. Хацелася б, каб, даследуючы маральныя пошукі вялікіх людзей, мы вучыліся ўменню весці сацыяльную барацьбу, актыўна ўключаліся ў барацьбу думак, якая адбываецца ў свеце.

Наша задача — выхаваць не толькі адукаванага чалавека, але ініцыятыўнага грамадзяніна, які думае, умее кіраваць краінай. Нашым студэнтам-журналістам гэта ўменне самастойна дзейнічаць асабліва неабходна. Мы ў сваім выхаваўчым працэсе павінны падрыхтаваць актывістаў да таго, каб яны самастойна правільна дзейнічалі, самі прымалі верныя, справядлівыя рашэнні, самі ажыццяўлялі ўсе неабходныя адміністратыўныя меры, у тым ліку пакаранне праз органы студэнцкага самакіравання.

Ёсць пытанні, якія прама датычацца і выкладчыкаў. Падзвіжніцтва працы педагога — спрадвечна руская традыцыя. Павага да настаўніка выпрацоўваецца ўзаемнай увагай, уменнем стрымліваць сябе. Рабяты не даруюць нам няўвагі, абыякавасці, падмены інтарэсу да сябе агульнымі словамі, адсутнасці зацікаўленасці ў выніках агульнай працы. Рашэнне любой выхаваўчай задачы магчыма толькі на шляхах індывідуальнага падыходу. Мы, педагогі, не маем права на «суету сует». Аднак, кінуўшы лозунг, мы часта забываемся аб канкрэтнай дапамозе і кантролі. Схема любога дзеяння павінна быць такая: патрабаванне — выкананне — кантроль. Асабісты прыклад выкладчыка тут нічым не замянімы.

**Т. АРЛОВА,**
**кандыдат мастацтвазнаўства.**

## Справы прафсаюзныя

Адбылося пасяджэнне прафсаюзнага актыву універсітэта, на якім ішла размова аб рабоце арганізацыйна-масавай камісіі прафкома БДУ, аб тым, якую дапамогу ў рабоце аказвае яна прафбюро факультэтаў.

З дакладам выступіў старшыня камісіі Н. Муромша. В. П. Шапялевіч расказаў аб рабоце спортклуба БДУ па арганізацыі спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў на факультэтах.

У канцы пасяджэння былі падведзены вынікі конкурсу на лепшае афармленне прафбюро факультэтаў. Месцы размеркаваны наступным чынам:

I — мехмат;
II — ФПМ;
III — фізфак.

**(Прэс-цэнтр прафкома).**

## Сустрэча з танцам

Гастрольны сезон народнага ансамбля народнага танца «Крыжачок» пачнецца з першага кастрычніка. На гэты раз творчы калектыў наведае са сваёй канцэртнай праграмай Аўстралію, Новую Зеландыю, астравы Фіджы. Пасля кароткага адпачынку самадзейныя артысты пачнуць рэпетыцыі канцэртнай праграмы. У мяркуемы рэпертуар народнага ансамбля ўвойдуць танцы народаў СССР: «Крыжачок», «Хора і Сырда», «Гапак» і харэаграфічная кампазіцыя «Паўлінка».

**С. АЛЯКСЕЕЎ.**

# Прайшоў камсамольскі сход

На факультэце журналістыкі прайшоў камсамольскі сход «Фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі: вопыт і актуальныя праблемы маральнага выхавання».

— Наша галоўная задача, — адзначыў у сваёй справаздачы сакратар камітэта камсамола факультэта В. Дудко, — гэта выдатная вучоба, грамадская і творчая актыўнасць. І зараз савецкі чалавек спалучае ў сабе ідэйную перакананасць і вялікую жыццёвую энергію, імкненне да высокіх ведаў і культуры, пачуццё калектывізму і таварыскасці, інтэрнацыяналізму і патрыятызму, сапраўдны гуманізм. Яго маральныя прынцыпы раскрываюцца перш за ўсё у самаадданай працы на карысць Айчыны, усвядомленай гатоўнасці, гаворачы словамі У. І. Леніна, «дзейнічаць так, як таго сапраўды камунізм патрабуе...».

Вялікую ўвагу прысутныя ўдзялілі абмеркаванню пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». На сходзе ішла гаворка аб ажыццяўленні канкрэтных мер па паляпшэнню ідэалагічнай работы, павышэнню яе эфектыўнасці і якасці, удасканаленню форм і метадаў, ліквідацыі наяўных недахопаў, пра тое, што ідэалагічную работу неабходна ўзняць на больш высокі якасны ўзровень, які адпавядае патрабаванням развітога сацыялізму, новым задачам камуністычнага будаўніцтва.

На сходзе было адзначана, што факультэцкі «Камсамольскі пражэктар» у руках журналістаў стаў эфектыўнай зброяй у барацьбе з прагульшчыкамі і «хвасцістамі». Але выступленні «Пражэктара», на жаль, мала абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах груп. Трэба павысіць рэзультатыўнасць рэйдаў і праверак.

**М. АНАТОЛЬЕЎ.**



Група механікаў трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта на экзамене па філасофіі. Здае Фам Дык Цінь, студэнт з брацкага В'етнама. Прымае экзамен дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў І. Г. Родзін.

Фота М. Дубовіка.

# З пачуццём гістарычнай адказнасці

**У пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» пастаўлены канкрэтныя задачы перад партыйнымі, камсамольскімі, грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку і перад камітэтамі ДТСААФ. Доўг абароннага таварыства— прывіваць маладому пакаленню пачуццё гістарычнай адказнасці за лёс сацыялізму, за працвітанне і абарону Савецкай Радзімы.**

**Нядаўна адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя арганізацыі ДТСААФ Белдзяржуніверсітэта, на якой былі падведзены вынікі работы за прайшоўшыя тры гады. Пасля яе на пытанні нашага карэспандэнта адказаў старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта М. В. Гарлатаў.**

**— Міхаіл Васільевіч, арганізацыя ДТСААФ БДУ імя У. І. Леніна лічыцца адной з лепшых сярод ВНУ сталіцы. У чым сакрэт гэтага поспеху?**

— Я лічу, што нашы поспехі дасягнуты перш за ўсё таму, што арганізацыя ДТСААФ працуе ў цесным кантакце з парткомам, камітэтам камсамола, прафсаюзнай арганізацыяй, саветам ветэранаў і іншымі арганізацыямі. Гэта дае магчымасць сканцэнтраваць свае намаганні на важнейшых пытаннях ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў.

**— Чым былі адметныя тры гады пасля правядзення чарговай справаздачна-выбарнай канферэнцыі?**

— Перш за ўсё тым, што яны былі гадамі вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму савецкага народа, выкліканага святкаваннем 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, 60-годдзя Узброеных Сіл СССР, 60-годдзя БССР і КПБ. Святкаванне гэтых знамянальных дат садзейнічала значнаму паляпшэнню абаронна-масавай работы і ваенна-патрыятычнага выхавання ва універсітэце. За тры гады праведзена 150 тэматычных вечароў, больш як 900 сустрэч з ветэранамі вайны, на якіх выступалі Героі Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Зайцаў, Р. Н. Мачульскі, І. С. Жыгараў, А. В. Кірсанаў і многія іншыя. Прачытана 2800 лекцый, праведзена 160 паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. 29 жніўня 1978 года арганізацыя ДТСААФ БДУ імя У. І. Леніна была ўзнагароджана юбілейным «Ганаровым знакам ДТСААФ СССР». Так што, як бачыце, ганарыцца нам ёсць чым.

**— А як справы з тэхнічнай падрыхтоўкай?**

— Намі падрыхтавана 126 шафёраў катэгорыі «В», 70 радыётэлеграфістаў, 1700 радыётэлефаністаў, 65 парашутыстаў. За справаздачны перыяд было праведзена 360 спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту, у ходзе якіх падрыхтавана 1055 спартсменаў-разраднікаў, у тым ліку: па кулявой стральбе — 390, радыёспорту— 93, веславанню на ялах 230 чалавек. Падрыхтавана таксама 4600 стралкоў па нормах ГПА.

Зроблена сапраўды многа. Але насцярожвае вось які факт: усе поспехі у рабоце арганізацыі ДТСААФ дасягнуты ў асноўным намаганнямі ўсяго некалькіх факультэтаў: гістарычнага, ФПМ, фізічнага, біялагічнага, хімічнага. Ніжэй сваіх магчымасцей працуе камітэт ДТСААФ радыёфізічнага факультэта, факультэта журналістыкі. Зусім незразумелай застаецца пазіцыя камітэта камсамола філалагічнага факультэта, які цалкам выпусціў з-пад кантролю работу камітэта ДТСААФ на факультэце. А старшыня камітэта ДТСААФ студэнт II курса Алег Камінскі, бачачы такую бескантрольнасць, зусім не праводзіць якой-небудзь значнай работы. Нават на пасяджэнні камітэта ДТСААФ універсітэта ён не ходзіць.

Ужо некалькі год застаецца адкрытым пытанне аб будаўніцтве 50-метровага стралковага ціра. А без яго універсітэцкай камандзе па стралковаму спорту не дабіцца высокіх вынікаў. Пытаннем яго будаўніцтва павінна з большай зацікаўленасцю займацца спартыўная кафедра універсітэта, а не толькі камітэт ДТСААФ, тым больш, што ён сваю задачу па навучанню студэнтаў стральбе выконвае — аб гэтым гавораць вышэйназваныя лічбы. А вось пытанне — чаму ва універсітэце няма моцных стралкоў — трэба адрасаваць спартыўнай кафедры. Каму, як не ёй, выхоўваць майстроў высокага класа? А калі так, то і клапаціцца аб будаўніцтве ціра трэба не толькі камітэту ДТСААФ, а спартыўнай і ваеннай кафедрам. Рашыць гэтае пытанне можна толькі разам.

Не прыходзіцца шмат гаварыць пра папулярнасць курсаў па падрыхтоўцы шафёраў катэгорыі «В». Жадаючых займацца на іх вельмі шмат, хаця абучэнне і платнае. Але да гэтага часу за камітэтам ДТСААФ не замацавана аўдыторыя. Усе магчымасці па стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы курсаў усё яшчэ застаюцца магчымасцямі, а добрага класа па аўтамабільнай падрыхтоўцы няма.

Што і гаварыць, праблемы ў нас ёсць. Але ўсе яны — праблемы нашага росту і, значыць, будуць вырашаны. Пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» ставіць перад намі новыя задачы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Думаю, што нам гэтыя задачы будуць пад сілу.

Запісаў **П. СТАСЕВІЧ.**



**Чацвёртакурснікі геаграфічнага факультэта здаюць экзамен па эканамічнай геаграфіі СССР.**

Фота **М. Дубовіка.**



**Настаўнік. Гэта ён дапамагае рабіць першыя крокі па жыцці, вучыць пісаць і чытаць, тлумачыць усё самае складанае, разумее цябе... Вось такой добрай і чулай настаўніцай хоча стаць для сваіх будучых вучняў і Зоя Дубіна, студэнтка I курса хімфака. Старанная вучоба, сур'ёзныя адносіны да заняткаў, пастаянная работа над сабой дапамагаюць Зоі наблізіцца да сваёй мэты.**

**Вялікім аўтарытэтам карыстаецца дзяўчына і ў сябе ў групе: Зоя — прафорг і добра ведае, што прафсаюзная работа, як і камсамольская, вельмі адказная, таму неабходна ведаць усё: і чаму сёння кагосьці няма на занятках, і каму трэба дапамагчы, і каго засяляць у інтэрнат. Амаль па ўсіх пытаннях Зоя заўсёды раіцца са сваімі сяброўкамі.**

**НА ЗДЫМКУ: Зоя ДУБІНА на практычных занятках.**
Фота І. Зяньковіч.

НАШЫ ВЫПУСКНІКІ

# ШЧОДРАСЦЬ

**(Працяг. Пачатак у № 19)**

На яе ўроках заўсёды так. Для таго, каб добра і трывала засвоіць новы матэрыял, неабходна ўспомніць мінулагодні.

Захапляючае падарожжа ў цудоўную і незвычайную краіну — слова—парушае звонкагалосы званок. І дзеці, акружыўшы цесным колам настаўніцу, вырашаюць незразумелыя пытанні. Ну, вось ўсё высветлена. Разам накіроўваемся ў настаўніцкую. Педагогі наперабой расказваюць тыя важныя падзеі, з якіх і складаецца штодзённае бурлівае жыццё школы. У гэты момант яны вельмі нагадваюць сваіх маленькіх выхаванцаў.

На размову нам адведзена некалькі хвілін. Таццяна Аляксандраўна не можа супакоіцца: «Пісаць пра мяне? У нас жа ёсць выкладчыкі з вялікім вопытам работы ў школе...». Крыху пазней мне стала зразумела, чаму іменна яе рэкамендаваў дырэктар Лелікаўскай сярэдняй школы: «Вельмі працавітая, добрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў...».

Паступова прыходзіла давер'е і прызнанне калег і вучняў. Асабліва цяжка было заваяваць давер'е апошніх. Яны ж такія розныя, не падобныя адзін на аднаго па густу, характару, схільнасцях. І да кожнага трэба знайсці індывідуальны падыход, падабраць свой, як кажуць, ключык.

Аднойчы яна захварэла, і хвароба прымусіла заставацца дома. Вучні яе кожны дзень наведвалі, па чарзе дзяжурылі ля ложка хворай. «А калі наша Таццяна Аляксандраўна паправіцца?». Так і казалі—«наша».

Ды хіба ж шукала яна ў жыцці лёгкіх шляхоў! Гэтаму вучыць і сваіх выхаванцаў.

— Вельмі люблю я дзяцей, — гаворыць Сахарук. — Можа таму ўспрымаю паводзіны іх як нешта звычайнае.

...Да пачатку ўрока заставалася ўсяго некалькі хвілін. Твар настаўніцы—строгі, задуменны. Можна ісці. Усё распланавана, вырашана і абдумана. Адкрывае дзверы, і маўклівую цішыню парушае мяккі голас:

— Добры дзень, дзеці!..

**НЕ ШУКАЙ ЛЁГКІХ ДАРОГ**

**«...Думаю, самае галоўнае для настаўніка — выхаваць у дзецях пачуццё асабістай адказнасці за лёс Айчыны, за тую вялікую справу, дзеля якой змагаліся іх дзяды і бацькі...»** (З размовы з настаўніцай Т. А. Сахарук).

...Дзяўчына хадзіла ў школу. І больш за ўсё любіла літаратуру. Не толькі таму, што яна лёгка давалася ёй. За жыццёвым лёсам герояў паўставаў другі свет для дзяўчыны. Таямнічы і загадкавы. Яна была гатова спрачацца з сябрамі, адстойваючы свайго героя. Не адну ноч Таццяна прасядзела за падручнікамі. Упарта і настойліва працавала... Школу закончыла на выдатна. А потым вучоба ў БДУ на філалагічным факультэце. Студэнцкія гады праляцелі непрыкметна.

Той першы ўрок у пятым класе і цяпер добра памятае. Вельмі доўга рыхтавалася да яго, а ўвайшла ў клас і, здаецца, усё-ўсё забыла, ніводнага слова не магла сказаць. Хвалявалася больш чым трэба. Пасля напружанай работы на ўроках, пазакласнай работы, сходаў і метадычных саветаў яе чакае вялікі стос вучнёўскіх сшыткаў, якія трэба тэрмінова праверыць. А колькі часу і сіл бярэ падрыхтоўка да ўрокаў наступнага дня.

— Зноў затрымалася? Ведаю: сход, дадатковыя заняткі, педсавет... Што там у цябе яшчэ? — гаспадыня хаты звыкла сыпала словамі.

— Ды хопіць вам. Час мірыцца, — Таццяна Аляксандраўна зняла паліто.

Знаёма цікаў гадзіннік. Яркае святло люстры слізгацела па кніжных паліцах.

— Блізка ад школы жывём, а нават паесці не прыйдзеш, — ужо з кухні выгаворвала гаспадыня, пазвоньваючы талеркамі. Але, незадаволеная яе маўчаннем, зноў паявілася ў пярэдняй, зірнула на разбухлы ад сшыткаў партфель:

— І сёння ўсю школу дадому прынесла?

Таццяна Аляксандраўна не ўстрымалася ад усмешкі. Потым яна паспешліва вячэрала, слухаючы расказы старой жанчыны. А калі ўвайшла ў свой пакой, ледзь не ўскрыкнула ад радасці: два пісьмы чакалі яе на рабочым стале. Ну, вядома ж, ад Анатоля і Святланы. Гаспадыня, напэўна, паспела прачытаць і маўчыць.

«...Піша Вам Анатоль. Вучуся па-ранейшаму. Часта ўспамінаю школу, настаўнікаў. Але часцей за ўсё прыгадваю Вас, Таццяна Аляксандраўна. Вы пакінулі ў маёй душы нязгасную любоў да Радзімы, любоў на ўсё жыццё...».

«Ах, Анатоль, Анатоль... Але ж, мабыць, нялёгка яму». Прачытала другое пісьмо — навучэнкі тэхнікума. І твар яе шчасліва святлее.

— Чытай, чытай. А я наўмысна пра пісьмы гэтыя—ні слова. Ведаю, есці не будзеш, а да іх пабяжыш, — прыадчыніл дзверы гаспадыня.

У доме, дзе жыве Сахарук, сціпла і проста. Усюды кнігі, кнігі... Яны на шафе, вялікім стосам на падаконніках, нават на падлозе.

І яшчэ падумалася: як жа параўнаць прастату і сціпласць абстаноўкі гэтага дома з бясцэнным скарбам духоўных каштоўнасцей яго гаспадароў, шчырай дабратой сэрцаў і высокай мараллю іх!

Пра вялікую любоў да родных прастораў, да Бацькаўшчыны гаворыць на ўроках настаўніца. А калі на прагулках Таццяна Аляксандраўна расказвае вучням аб нашай краіне, ім здаецца: яны ўзнімаюцца з ёю на высокую гару, з якой відаць уся Радзіма. Нават дух захоплівае: якая яна неабсяжная, прыгожая!

Гэты чалавек навучыў дзяцей пісаць словы. І не толькі пісаць — разумець, адчуваць іх.

— А што патрэбна для таго, каб быць шчаслівым? — звярнуўся я з пытаннем да настаўніцы.

— Хочаш быць шчаслівым, не шукай лёгкіх дарог... Усё жыццё я імкнулася ўзнімаць сваіх вучняў да разумення таго, што не словам, а справай слаўны чалавек, што годнасць кожнага складаецца са штодзённых паводзін, з будзённых спраў, якія патрабуюць часам ад чалавека сапраўднага гераізму.

**А. МАРЧУК.**